# ТРАГЕДЫЯ ВЁСКІ КНЯЖАВОДЦЫ

**П. І. Тамукевіч**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,
г. Гродна, Беларусь

Навуковы кіраўнік – загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук, канд. гіст. навук, дацент С. А. Сіткевич

Вялікая Айчынная вайна, колькі думак узнікае, калі мы чуем гэтыя словы. Для кожнага беларуса ўспаміны аб гэтай страшнай падзеі вызываюць дрыжыкі па скуры і слёзы на вачах. Колькі было забіта людзей, знішчана гарадоў і вёсак – страшна нават падумаць. Жорсткасць нямецкіх захопнікаў не мела ніякай меры. Яны забівалі, палілі, руйнавалі амаль усё, што было на іх шляху. Нажаль, выключэннем не стала і вёска Княжаводцы, якая была знішчана 23 ліпеня 1943 года.

*Мэта дакладу* – паведаміць аб жорсткай падзеі ў гады Вялікай Айчынай вайны, адлюстраваць, якія страты панёс беларускі народ. Развіць пачуццё грамадзянства, патрыятызму. Захаваць гістарычную памяць аб гісторыіі вёскі.

Лета было ў разгары. Пасля цяжкага працоўнага дня людзі адпачывалі, набіраліся сіл. Але ж сон перапыніў брэх сабак. На світанні пачуліся глухія ўдары ў дзверы хатаў. Зрываліся засоўкі, у дамы ўрываліся гітлераўцы. Спалоханныя старыя і малыя зляталі з ложкаў. Усім загадвалі выйсці на вуліцу. Плакалі дзеці, шчыльней прытуляліся да бацькоў, а тыя сваімі целамі засланялі іх ад удараў.

На дварэ людзі ўбачылі, што вёска шчыльным кальцом акружана фашыстамі і іх прыслужнікамі – паліцаямі. З сабой немцы мелі сабак. Усіх жыхароў пачалі зганяць у тры вялікія гумны. Адначасова рабавалі і звозілі ў адно месца сялянскае дабро. Туды заганялі жывёлу. Хто спрабаваў схавацца, знаходзілі і на месцы расстрэльвалі. Ульяна Мінько паспрабавала ўцячы з маленькай дачкой на руках. Фашыст аўтаматчык чаргой скасіў яе. Дзяўчынка была жывая. Яна глядзела спалохана, не разумеючы, што здарылася. У гэты час раздалася другая аўтаматная чарга. Дзяўчынка перастала крычаць, змоўкла назаўжды, як і яе маці.

На беразе Нёмана была выкапана вялізная магіла. Сюды прывозілі партыямі людзей і расстрэльвалі. Хутка вёска запалала.

Рэпазіторый ГрДМУ

Фашысцкія каты з факеламі падбягалі да будынкаў і падпальвалі іх. Тыя, хто схаваўся ў хатах ці гумнах, былі зажыва спалены.

Нямногім жыхарам вёскі ўдалося вырвацца з лап забойцаў. Сярод іх былі Мікалай Барадаўка і яго сястра Люба, Зінаіда Жук (зараз Дзябёлая), Мікалай Кавальчук, Ганна Міхалевіч.

Зінаідзе Жук тады было 11 гадоў. Яе разам з бацькамі і іншымі аднавяскоўцамі загналі ў гумно. Хтосьці з дарослых выкінуў камень з падмурка і загадаў дзецям уцякаць. Сямёра малых выбеглі з гумна. Траіх фашысты тут жа расстралялі, а чацвярым удалося схавацца ў жыце і ўцячы, у тым ліку і Зіне.

Кожны з іх з болем у сэрцы ўспамінае той страшны дзень 23 ліпеня 1943 г. Калі яны расказваюць аб гэтай трагедыі, на вачах з'яўляюцца слёзы.

Цікавасць уяўляюць два матэрыялы – жыхара вёскі Дубна Н. Сядача і свяшчэнніка Анатоля Корзуна. Гэта сведчанне відавочцаў расправы з мірнымі жыхарамі.

Вось аб чым сведчыць жыхар вёскі Дубна: "Пад пагрозаю зброі мы выкапалі магілы, апырскаўшы іх слязамі адчаю і бяссілля. Потым нас загналі за хлеў. Дзесяць немцаў сталі ўздоўж выкапанай ямы. Яны былі ўзброены аўтаматамі і пісталетамі. Дзесяць іншых катаў вывалаклі з хлява дзесяць княжаводцаў. Тут былі жанчыны з груднымі дзецьмі, падлеткі. Маці падалі на калені, сутаргава хапалі за боты катаў, прасілі аб літасці да малюткаў. Іх падымалі з зямлі ўдарамі прыкладаў, уколамі штыроў. Хутка немцам удалося паставіць свае ахвяры тварам да ямы. Раздалося некалькі выстралаў. Крыкнула нейкая жанчына і імгненна наступіла цішыня. Людзі згубілі дар мовы. Адно дзіця пры забойстве маці ўпала ў яму. Афіцэр праткнуў яго штыком і падняў у паветра. Больш я не мог глядзець. Збіўшыўся ў кучу за хлявом, мы плакалі, бяссільныя, не маглі дапамагчы сваім братам".

Свяшчэннік А. Корзун як бы дапаўняе гэты расказ: "Нямецкія каты не толькі расстрэльвалі, але і кідалі ў магілы жывымі малых і падлеткаў. Дзеці, не ўсведамляючы, што над імі дзеецца, сваімі ручкамі праціралі вочкі, калі пясок, які падаў з рыдлёўкі, засыпаў іх. І доўга пасля нечуванай расправы яшчэ варушылася сырая зямля…".

Пасля расправы над мірнымі жыхарамі паўсюдна ў вёсках былі расклееныя аб'явы, выдадзеныя на нямецкай, польскай і беларускай мовах. У іх паведамлялася аб расправе фашысцкіх галаварэзаў над мірнымі жыхарамі вёскі Княжаводцы. Гэта – неабвяржымы



Репозиторий ГрГМУ

дакумент, які выкрывае фашысцкіх захопнікаў, іх ман'яцкія планы заняволіць і паставіць на калені свабодалюбівы беларускі народ. Зверскімі ўчынкамі фашысты думалі запалохаць насельніцтва навакольных вёсак. Але выйшла наадварот. Людзі ішлі ў лясы да партызан, каб са зброяй у руках помсціць ворагу за пакуты і здзекі. Гарэла зямля пад нагамі фашыстаў. Усюды чакала іх расплата за слёзы і кроў людскую.

Фашысты спачатку расстралялі жыхароў вёскі Княжаводцы. У вялізных магілах яшчэ не застыла людская кроў, як каты ўзяліся за новую справу – забіраць маёмасць, зганяць у адно месца жывёлу замучаных, каб потым нарабаванае дабро адправіць у Нямеччыну.

Пасля таго, як скарб сялян быў пагружаны ў машыны, вёска Княжаводцы запылала ў агні. Савецкія лётчыкі пабачылі, што засталася толькі вялікая груда камянёў, ды некалькі бярозак, спаленых пажарам.

У вёсцы Княжаводцы па-зверску былі расстраляны 970 чалавек з 1383 жыхароў. Адзначаецца, што "многія жыхары, у тым ліку і дзеці, былі жывымі кінуты ў магілу і засыпаны зямлёй". Было спалена 152 двары, засталося 68, якія знаходзіліся на хутарах.

Вялікая Айчынная вайна не шкадавала нікога, загінула вельмі шмат людзей. Салдаты, партызаны, мірныя жыхары змагаліся ўсімі сіламі, не звяртаючы ўвагу ні на што. Мы памятаем кожнага, людзі жывуць, пакуль жыве памяць пра іх.

**Літаратурныя крыніцы:**

1. Фронтовая газета про трагедию деревни Княжеводцы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://mosty.grodno–region.by/ru/kniaavodcy–ry–ru/. – Дата доступа: 20.03.2023.

2. Крылья советов : красноармейская газета [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.prlib.ru/section/706591. – Дата доступа: 20.03.2023.

Репозиторий ГрГМУ